**ЦЫТАТА** ( ням. Zitat ад лац. cito – выклікаю, прыводжу), даслоўная вытрымка з якога небудзь тэксту ці літаральна перададзеныя чые-небудзь словы. Як правіла, цытата выкарыстоўваецца для тлумачэння ці пацвярджэння аўтарскай думкі: *Паводле думкі мастацтвазнаўцаў, найбольш цікавымі з'яўляюцца агоўскія куфры. У сёмым томе Беларускай Савецкай Энцыклапедыі гаворыцца: "Огаўскія куфры (агоўскія куфры) – пашыраная ў мастацтвазнаўстве назва размаляваных куфраў, вырабаў майстроў з вёскі Агова Іванаўскага раёна… Маюць пукатае века, багатую рознакаляровую размалёўку. Паводле трактоўкі плоскасці дэкор куфраў ідзе ад народнага ткацтва… Элементы размалёўкі – кветкі, лісце, травы, калоссе, звяркі…*" (У. Ягоўдзік).

Сказы з цытатамі афармляюцца тымі ж знакамі прыпынку, што і канструкцыі з простай мовай з двукоссем: *Няпрэймы захопнікам выступіў ад Наваградка Усяслаў, і дзясятага красавіка адбылася бітва, якая набыла сусветную вядомасць, дзякуючы генію аўтара "Слова пра паход Ігаравы". Вось што ён занатаваў: " На Нямізе снапы сцелюць з галоў, малоцяць цапамі булатнымі, на таку жыццё кладуць, веюць душу ад цела. Нямігі крывавыя берагі не дабром засеяны, засеяны касцямі рускіх сыноў"* (К. Тарасаў).

Скарачэнне цытаты абазначаецца шматкроп'ем: *Але пакуль што спынім увагу на нечаканым выразе: "... змалку выпрацаваны арыстакратычна-духоўны погляд на няхват скарынкі хлеба ў селяніна…"* (А. Адамовіч).

Калі цытата мае вершаваную форму, то яна ў двукоссе не бярэцца: *І нават у славутай лысагорскай паэме, дзе беларускія пісьменнікі падаюцца ў зніжана-іранічным асвятленні, Янічыц выступае як гераіня станоўчая:*

*З глыбінь народнага жыцця*
*Увысь ірвалася Янічыц –*
*Палесся мілае дзіця* (Д. Бугаёў).

Калі цытата або яе часткі натуральна ўпісваюцца ў структурную арганізацыю сказа, то яны бяруцца ў двукоссе і пачынаюцца з малой літары: *Якуб Колас не быў бы тым Якубам Коласам, якога мы сёння ведаем, калі б ён не паказаў "вобразы мілыя роднага краю" – цудоўную красу беларускай прыроды ва ўсе поры года, ва ўсіх мнагалікіх праявах* (М. Стральцоў).

Своеасаблівай разнавіднасцю цытаты з'яўляецца эпіграф. Эпіграф (ад грэч. epigraphe – надпіс) – выказванне ў выглядзе прыказкі, цытаты з іншых твораў, якое змяшчаецца пасля загалоўка і выяўляе асноўную ідэю або прасвятляе замысел твора. Так, напрыклад, у зборніку Максіма Багдановіча "Вянок":

*ЛЕТАПІСЕЦ*

*Усё прайшло, мінула*
*Як і не было,*
*У капцах паснула,*
*Зеллем парасло.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Я. Купала*

*Душой стаміўшыся ў жыццёвых цяжкіх бурах,*
*Свой век канчаю я у манастырскіх мурах.*
*Тут ціша, тут спакой, – ні шуму, ні клапот.*

Традыцыйна эпіграф размяшчаецца з правага боку пасля загалоўка і ў двукоссе не бярэцца.

У навуковай літаратуры цытаты афармляюцца ў адпаведнасці з пэўнымі патрабаваннямі, якія ставяцца да прац таго ці іншага тыпу.

*С.С.Мароз*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ